УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ШМАКАЎ ФЁДАР ІВАНАВІЧ

## АКЦЁР, РЭЖЫСЁР, НАРОДНЫ АРТЫСТ СССР

## 1 САКАВІКА (16 ЛЮТАГА) 1917 Г. – 1 МАЯ 2009 Г.

**ФОНД № 285**

**ВОПІС № 1**

**1939 г. – 1981 г.**

**МІНСК 2017**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 285**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Ф.І. ШМАКАВА | 1 - 37 | 1 - 5 |
| 1.1. | ТЭКСТЫ РОЛЯЎ, СЫГРАНЫХ Ф.І. ШМАКАВЫМ У ТЭАТРЫ ІМЯ Я.КОЛАСА | 1 - 2 | 1 |
| 1.2. | ФАТАГРАФІІ Ф.І. ШМАКАВА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ | 3 - 34 | 1 - 5 |
| 1.3. | КАДРЫ З ФІЛЬМАЎ З УДЗЕЛАМ Ф.І. ШМАКАВА | 35 - 37 | 5 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Ф.І. ШМАКАВА | 38 - 42 | 5 - 6 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ПРА Ф.І. ШМАКАВА | 43 - 51 | 6 - 7 |
| 4. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 52 - 61 | 7 - 8 |

## Прадмова

**Шмакаў Фёдар Іванавіч** нарадзіўся 1 сакавіка ( 16 лютага) 1917 г. у Петраградзе. Дзяцінства прайшло ў п. Рашаль Ленінградскай вобласці (зараз п.Марыянбург). Скончыў 7 классаў, школу фабрычна-завадскога навучання (1932 – 1934). Працаваў слесарам на рашальскам заводзе № 14, удзельнічаў у драматычным гуртку завода. З 1935 г. да 1939 г. вучыўся ў Ленінградскім тэатральным інстытуце (курс В.В. Мяркур'ева). З 1939 г. да 1941 г. працаваў у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР у г.Магілёве (зараз Нацыянальны акадэмічны рускі драматычны тэатр імя М. Горкага), сыграў ролі: Вожеватова ("Бесприданница"), Васи ("Таланты и поклонники"), Фабио ("Собака на сене") і інш. З 1941 г. да 2009 г. працаваў у тэатры імя Я. Коласа, сыграў ролі: Авадзень ("Авадзень"), Аксёна Каля ("Навальніца будзе"), Мацвейка ("Небыспечны спадарожнік"), Леніна ("Сям'я"), Канстанціна ("У бэзавым садзе"), Пеці Грамыкіна ("Цудоўны сплаў"), Андрэя Лабанава ("Шукальнікі") і інш. У 1944 г. працаваў у франтавой тэатральнай брыгадзе. З 1960-х гг. выступаў як рэжысёр тэатра імя Я. Коласа, ажыццявіў пастаноўкі спектакляў: "Шануй бацьку свайго" В. Лаўрэнцьева (1964), "Чатыры крыжы на сонцы" А. Дзялендзіка (1965), "Бацькаўшчына" К. Чорнага (1967), "Зберажы маю тайну" В. Сабко (1967), "Трывога" А.Л.Петрашкевіча (1974), "Мудрамер" М.Я. Матукоўскага (1988), "Блэз" К. Манье (1991), "Верачка" А.Я. Макаёнка (1992), "Праўда добра, а шчасце лепш" А.М. Астроўскага (2000). З 1957 г. здымаўся ў кіно, сыграў ролі: Юсалова ("Бессмертная песня" М. Валадарскага), Андрея Размётнова ("Поднятая целина" А. Іванова), Уварова ("Балтийское небо" У. Венгераў) і інш.

Ф.І. Шмакаву было прысвоена званне заслужаны артыст БССР (1952), народны артыст БССР (1959), народны артыст СССР (1975). Узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй БССР за выкананне ролі У.І. Леніна ў спектаклі "Шостае ліпеня" М.Ф. Шатрова (1968), прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" (2001). Узнагароджаны ордэнамі: "Знак Пашаны" (1955), "Працоўнага Чырвонага Сцяга" (1971), "Дружбы народаў" (1987); медалём Ф. Скарыны (1997).

Памёр Ф.І. Шмакаў 1 мая 2009 г. Пахаваны на Мазурынскіх могілках у Віцебску.

Дакументы Ф.І. Шмакава паступілі ў аддзел фарміравання НАФ БДАМЛМ ад самаго Ф.І. Шмакава ў 1981 г. У 1984 г. дакументы Ф.І. Шмакава прайшлі экспертызу гістарычнай і навуковай каштоўнасці. У 2017 г. праведзена навукова-тэхнічная апрацоўка. У выніку апрацоўкі фонду складзены вопіс № 1 у колькасці 61 справы (126 дакументаў) за 1939 – 1981 гг.[1]

---

[1] Частка дакументаў Ф.І. Шмакава захоўваецца ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці (ф. 1537) як фонд асабістага паходжання

Вопіс складаецца з 4-х раздзелаў.

1. У раздзел “Творчыя дакументы Ф.І. Шмакава” ўвайшлі 3 падраздзелы, справы ў якіх сістэматызаваны па храналогіі за 1939 – 1981 гг. Невялікі падраздзел 1.1. склалі тэксты роляў, сыграных Ф.І. Шмакавым у тэатры імя Я. Коласа ў 1961 і 1964 гг.

1.2. У падраздзел увайшлі фатаграфіі ў ролях і сцэн з спектакляў, сыграных у тэатры імя Я. Коласа: Гарацыо (“Гамлет” У. Шэкспіра), У.І. Ульянава (“Сям’я” І.С. Папова), Мацвейкіна (“Небяспечны спадарожнік” А.Д. Салынскага), Леніна (“Вечная крыніца” Дз. Зорына; “Шостае ліпеня” М.Ф. Шатрова), Эдгара (“Кароль Лір” У. Шэкспіра), Вадзіма (”Чатыры крыжы на сонцы” А.А. Дзялендзіка), Прысыпкіна (“Клоп” У.У. Маякоўскага), “Несцеркі (“Несцерка” В. Вольскага), Альховіка (“Трывога” А.Л. Петрашкевіча) і інш. за 1946 – 1981 гг.

За падраздзелам змешчана справа з фатаграфаіямі ў ролях з спектакляў, сыграных у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР: Вожеватова (“Бесприданница” А.М. Астроўскага), Васи (“Таланты и поклонники” А.М. Астроўскага), (“Кремлевские куранты” М.Ф. Пагодзіна) за 1939 – 1940 гг.

1.3. У падраздзел увайшлі фатаграфіі Ф.І. Шмакава з кадраў мастацкіх фільмаў: “Бессмертная песня”, “Балтийское небо”, “Поднятая целина”. 1957 – 1961 гг.

2. У раздзеле “Дакументы да біяграфіі Ф.І. Шмакава” справы сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе за 1939 – 1948 гг. У ім змешчаны праграмы і афішы спектакляў і інш.

3. У раздзеле “Дакументы пра Ф.І. Шмакава” справы сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе за 1942 – 1979 гг. У ім змешчаны артыкулы, рэцэнзіі і водгукі на спектаклі з удзелам Ф.І. Шмакава.

4. У раздзеле “Выяўленчыя дакументы Ф.І. Шмакава” справы сістэматызаваны па храналагіі за 1930-я – 1970-я гг. У ім змешчаны фатаграфіі Ф.І. Шмакава, індывідуальныя і ў групах з З.І. Канапелькай, М.М. Яроменка, А.К. Ільінскім, Ю.Б. Шчарбаковым, А.Р. Шэлегам і інш.

Прадмову склала Н.П. Прынько
вяд. архівіст
12.07.2017

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

______________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Ф.І. ШМАКАВА** | | | | |
| | **1.1. ТЭКСТЫ РОЛЯЎ, СЫГРАНЫХ Ф.І. ШМАКАВЫМ У ТЭАТРЫ ІМЯ Я.КОЛАСА** | | | | |
| 1 | Роля Лемяшэвіча з п'есы "Крыніцы" паводле І.П. Шамякіна, сыграная Ф.І. Шмакавым у тэатры імя Я. Коласа.<br>Машынапіс з паметамі | 1961 | 19 | 1 | |
| 2 | Роля Эдгара з п'есы "Кароль Лір" У. Шэкспіра, сыграная Ф.І. Шмакавым у тэатры імя Я. Коласа.<br>Машынапіс з паметамі | 1964 | 16 | 1 | |
| | **1.2. ФАТАГРАФІІ Ф.І. ШМАКАВА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ** | | | | |
| 3 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава ў ролі Гарацыо з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Гамлет", пастаўленага рэж.В.М. Бебутавым па п'есе У. Шэкспіра, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Ф.І. Шмакава, М.Л. Федароўскага (у ролі Гамлета).<br>Арыгінал і копія | 1946, [1960-я гг.] | 2 | 2 | |
| 4 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава ў ролях: Авадзеня ("Авадзень" па раману Э.Л. Войніч, рэж. Г.В. Осіпаў), Сінцова ("Ворагі" М. Горкага, рэж. І.М. Раеўскі), Махно ("Нараджэнне свету" паводле А.М. Талстога, рэж. М.А. Міцкевіч), сыграных у тэатры імя Я. Коласа | 1948, 1955 | 3 | 3 | |
| 5 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Песня нашых сэрцаў", пастаўленага рэж. М.А. Міцкевічам па п'есе В. Палескага з удзелам Ф.І. Шмакава, З.С. Вялікага, А.К. Ільінскага | 1949 | 1 | 1 | |
| 6 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Сям'я", пастаўленага рэж. А.Б. Скібнеўскім па п'есе І.С. Папова з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі У.Ульянава), М.С. Бялінскай (у ролі Марыі Аляксандраўны) | 1950 | 1 | 1 | |
| 7 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Небяспечны спадарожнік", пастаўленага рэж. Н.Б. Лойтарам па п'есе А.Д. Салынскага, з удзелам Ф.І. | 1953 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Шмакава (у ролі Мацвейкіна), А.Р. Шэлега (у ролі Карчэмнага) | | | | |
| 8 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "У бэзавым садзе", пастаўленага рэж. А.Б. Скібнеўскім па п'есе Ц.С. Саладара, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Канстанціна), А.П. Радзялоўскай (у ролі Мадлен) | 1954 | 1 | 1 | |
| 9 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава ў ролі Андрэя Лабанава ("Шукальнікі" паводле раману Д.А. Граніна, рэж. Н.Б. Лойтар), сыгранай ў тэатры імя Я. Коласа, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Ф.І. Шмакава, А.М. Труса (у ролі Барысава), Г.А. Арловай (у ролі Майі), І.А.Матусевіча (у ролі Крывіцкага) і інш. | 1955 | 2 | 2 | |
| 10 | Фатаграфіі сцэн з спектакля "Цудоўны сплаў" тэатра імя Я. Коласа, пастаўленага рэж. В.У. Броўкіным і Сафронавай па п'есе У.М. Кіршона, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Пеці Гарамыкіна). М.Л. Федароўскага (у ролі Гошы Філіпава) | 1956 | 3 | 3 | |
| 11 | Фатаграфіі сцэн з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Вечная крыніца", пастаўленага рэж. А.Б. Скібнеўскім па п'есе Дз. Зорына, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Леніна), А.Р. Шэлега (у ролі Мартына), З.І. Канапелькі (у ролі Васілісы) і інш. | 1957 | 3 | 3 | |
| 12 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Тры салаў'і, д.17", пастаўленага рэж. В.У. Броўкіным па п'есе Д. Дабрычаніна, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Пэпі), А.М. Лаппо (у ролі Міхася), А.П. Радзялоўскай (у ролі Гаспы Наты) | 1957 | 1 | 1 | |
| 13 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава ў ролях: Аксёна Каля ("Навальніца будзе" паводле аповесці "У глыбі Палесся" Я. Коласа, рэж. Ю.Б.Шчарбакоў), Сталярова ("Пачатак жыцця" К. Фіна, рэж. Ю.Б.Шчарбакоў), сыграных у тэатры імя Я. Коласа | 1958 | 4 | 4 | |
| 14 | Фатаграфіі сцэн з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Іркуцкаяагісторыя", пастаўленага рэж. Ю.Б. Шчарбаковым па п'есе А.Ф. Арбузава, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Сяргея), М.І. Бабок (у ролі Валі), Я.К. Глебоўскай (у ролі Няні). Арыгіналы і копія | 1960 | 3 | 3 | |
| 15 | Фатаграфіі сцэн з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Сяржант міліцыі", пастаўленага рэж. Б.М. Браганцавым па п'есе І.Г. Лазуціна, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Захарава). А.М. Труса (у ролі | 1960 | 3 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Грыгор'ева), М.П. Цішачкіна (у ролі Зайчыка), Г.П. Маркінай ( у ролі Наташы), І.А. Матусевіча ( у ролі Князя) | | | | |
| 16 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава ў ролі Аляксея Жмакіна ("Адзін год" паводле раману Ю.П. Германа, рэж. Б.М. Браганцаў), сыграная ў тэатры імя Я. Коласа, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Ф.І. Шмакава, А.Р. Шэлега (у ролі Палкоўніка), А. Яленскай (у ролі Клаўдзіі).<br>Арыгінал і копіі | 1961 | 3 | 3 | |
| 17 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава ў ролях: Пісьменніка ("Выгнанне блудніцы" І.П. Шамякіна, рэж. Б.М. Браганцаў), Старшыні калгаса ("Праўда і крыўда" паводле раману М.А. Стэльмаха, рэж. А.С. Падабед), сыграных у тэатры імя Я. Коласа | 1961, 1965 | 2 | 2 | |
| 18 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Кароль Лір", пастаўленага рэж. А.С. Падабедам па п'есе У. Шэкспіра, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Эдгара), А.М. Труса (у ролі Караля Ліра), Г.С. Дубава (у ролі Шута) | 1965 | 1 | 1 | |
| 19 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Разбуджанае сумленне", пастаўленага рэж. В.К. Скарабагатавым па п'есе В. Шаўрына, з удзелам Ф.І. Шмакава ( у ролі Фёдара Галая), Л.Н. Усанавай (у ролі Зоры).<br>Копія | 1965 | 1 | 1 | |
| 20 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Чатыры крыжы на сонцы", пастаўленага рэж. В.К. Скарабагатым і Ф.І. Шмакавым па п'есе А. Дзялендзіка, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Вадзіма), Г.А. Каральковай (у ролі Інгі) | 1965 | 1 | 1 | |
| 21 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава ў ролі Леніна ("Шостае ліпеня" М.Ф. Шатрова, рэж. С.С. Казіміроўскі), сыгранай у тэатры імя Я. Коласа, і сцэн з гэтага спектакля з удзелам Ф.І. Шмакава, В.Ф. Рубана (у ролі Свярдлова), М.П. Цішачкіна (у ролі Мюллера), М.П. Звездачотава (у ролі Бонч-Бруевіча), А.Р. Шэлега (у ролі Чычэрына).<br>Арыгіналы і копія | 1967 | 7 | 7 | |
| 22 | Фатаграфіі сцэн з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Клоп", пастаўленага рэж. Б.У. Эрыным па п'есе У.У. Маякоўскага, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Прысыпкіна), Г.П.Маркінай (У ролі Эльзевіры), В.Ф. Рубана (у ролі Давіда). | 1968 | 3 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Арыгіналы і копія | | | | |
| 23 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава ў ролі Несцеркі ("Несцерка" В. Вольскага, рэж. Н.Б. Лойтар), сыграная ў тэатры імя Я. Коласа, і сцэн з гэтага спектакля з удзелам Ф.І. Шмакава, Я.Г. Буракова (у ролі Першага шляхціча), Т.А. Кокштыса (у ролі Другога шляхціча) | [1963 - 1981] | 3 | 3 | |
| 24 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Трывога", пастаўленага рэж. Ф.І. Шмакавым па п'есе А.Л. Петрашкевіча, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Альховіка), З.І. Канапелькі (у ролі Міхаліны), Г.М. Кухальскай (у ролі Матулевіч) | 1974 | 1 | 1 | |
| 25 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Правінцыяльныя анекдоты", пастаўленага рэж. В.Я. Мазынскім па п'есе А.В. Вампілава, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Калошына), А.С. Цвятковай (у ролі Вікторыі) | 1975 | 1 | 1 | |
| 26 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Апошняя інстанцыя", пастаўленага рэж. С.С. Казіміроўскім па п'есе М.Я. Матукоўскага, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Малахава), Б.І. Сяўко (у ролі Дзімкі) | 1976 | 1 | 1 | |
| 27 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Разгром", пастаўленага рэж. В.Я. Мазынскім паводле раману А.А. Фадзеева, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Левінсона), У.А. Куляшова (у ролі Сташынскага) | 1977 | 1 | 1 | |
| 28 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Кастусь Каліноўскі", пастаўленага рэж. В.Я. Мазынскім па п'есе У.С. Караткевіча, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Мураўёва), У.А. Куляшова (у ролі Кастуся Каліноўскага) | 1978 | 1 | 1 | |
| 29 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Летась у Чулімску", пастаўленага рэж. В.Я. Мазынскім па п'есе А.В. Вампілава, з удзелам Ф.І. Шмакава, Т.У. Ліхачовай (у ролі Валянціны) | 1978 | 1 | 1 | |
| 30 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Скорыя цягнікі", пастаўленага рэж. В.М. Раеўскім па п'есе А.Г. Паповай, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Чарапанава), А.Ф. Мельдзюковай (у ролі Варвары Іванаўны) | 1978 | 1 | 1 | |
| 31 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Тры мяшкі засмечанай пшаніцы", пастаўленага | 1979 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | рэж. В.Я. Мазынскім паводле У.Ф. Цендракова, з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Адрыяна), Ю. Засядацелява (у ролі Жэнькі Тулупава) | | | | |
| | * * * | | | | |
| 32 | Фатаграфіі сцэн з нявызначаных спектакляў тэатра імя Я. Коласа, з удзелам Ф.І. Шмакава, А.К. Ільінскага, Г.П. Маркінай, Л.А. Нісневіч, А.Р. Шэлега | [1960-я - 1970-я гг.] | 4 | 4 | |
| 33 | Фатаграфяі сцэны з нявызначанага тэатральнага прадстаўлення тэатра імя Я. Коласа з удзелам Ф.І. Шмакава, І.А. Матусеівча, М.П. Цішачкіна | [пач. 1960-х гг.] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 34 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава ў ролях: В.Д. Вожеватова ("Бесприданница" А.М. Астроўскага, рэж. А.Л. Салееў), Беспризорника ("Кремлевские куранты" М.Ф. Пагодзіна, рэж. С.Ф. Уладычанскі), Васи ("Таланты и поклонники" А.М. Астроўскага, рэж. Л. Віўен і В.В. Мяркур'еў) і інш., сыграных у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР. Арыгіналы і копія | 1939 - 1940 | 4 | 4 | |
| | **1.3. КАДРЫ З ФІЛЬМАЎ З УДЗЕЛАМ Ф.І. ШМАКАВА** | | | | |
| 35 | Фатаграфія кадраў з мастацкага фільма рэж. М. Валадарскага "Бессмертная песня" з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Юсалава). "Ленфільм" | 1957 | 1 | 1 | |
| 36 | Фатаграфія кадра з мастацкага фільма рэж. У. Вянгерава "Балтийское небо" з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі комиссара Уварова), П.П. Глебава (у ролі маёра Лунина). "Ленфільм" | 1961 | 1 | 1 | |
| 37 | Фатаграфія кадра з мастацкага фільма рэж. А. Іванова "Поднятая целина", з удзелам Ф.І. Шмакава (у ролі Андрея Разметнова), Я.С. Мацвеева (у ролі Макара Нагульного). "Ленфільм" | 1961 | 1 | 1 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Ф.І. ШМАКАВА** | | | | |
| 38 | Загад Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР аб аб'яўленні Ф.І. Шмакаву падзякі за ўдзел у спектаклі рэж. Ю.А. Арынянскага "Сынишка". Машынапіс за подпісам намесніка дырэктара К.Г. Нагорскага | 1939 | 1 | 1 | |
| 39 | Праграмы спектакляў Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР "Бесприданница", "Коварство и | 1939 - 1940 | 9 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | любовь", "Кремлёвские куранты" і інш., з удзелам Ф.І. Шмакава.<br>З надпісам С.Ф. Уладычанскага Ф.І. Шмакаву на адвароце Л. 8 | | | | |
| 40 | Афіша спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР "Сынишка" М.Мэйо і М.Эннекен, з удзелам Ф.І. Шмакава ў час гастроляў у г.Орша.<br>На адвароце паметы Ф.І. Шмакава "11-12-13/XII.1939" | 1939 | 1 | 1 | |
| 41 | Афіша Вялікага дабрачыннага вечара-канцэрта ў Акруговым доме афіцэраў у дапамогу дзецям-сіротам з удзелам Ф.І. Шмакава, Л.П. Александроўскай, І.М. Балоціна, М.І. Дзянісава, Р.В. Млодак і інш. | 1947 | 1 | 1 | |
| 42 | Гастрольная афіша спектакля тэатра імя Я. Коласа "Овод" паводле раману Э.Л. Войніч з удзелам Ф.І. Шмакава. Мінск | 1948 | 1 | 1 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ПРА Ф.І. ШМАКАВА** | | | | |
| 43 | Артыкул Г.Б. Асвяцінскага пра гастролі тэатра імя Я. Коласа ў Львове з упамінаннем Ф.І. Шмакава і інтэрв'ю з І.Л. Дорскім. На беларускай і ўкраінскай мовах.<br>Выразкі з газет | 1959, 1979 | 2 | 2 | |
| 44 | М. Манохін. "Выбор был правильным".<br>Г.П. Маркіна. "Прызнанне".<br>Артыкулы пра Ф.І. Шмакава.<br>Машынапіс, выразка з газеты | 1961, 1975 | 6 | 2 | |
| 45 | У. Крыніца. "Равеснік кастрычніка".<br>М. Манохін. "Заўсёды ў дарозе".<br>Артыкулы да 50-годдзя з дня нараджэння Ф.І. Шмакава.<br>Выразкі з газет | 1967 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 46 | Рэцэнзіі Э.Я. Ліпавецкага, Г. Горава на спектаклі "Фронт", "Крылатае племя", пастаўленыя ў БДТ-2, з упамінаннем Ф.І. Шмакава.<br>Выразкі з газет | 1942, 1943 | 2 | 2 | |
| 47 | Рэцэнзіі В. Захарава, Л. Маркава, А. Маўзона і інш. на спектаклі "Адзін год", "Андрэй Лабанаў", "Выгнанне блудніцы" і інш., пастаўленыя ў тэатры імя Я. Коласа, з упамінаннем Ф.І. Шмакава.<br>Выразкі з газет | 1948 - 1978 | 11 | 11 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 48 | Рэцэнзія і водгукі акцёраў і гледачоў на спектакль "Сям'я", пастаўлены ў тэатры імя Я. Коласа, з упамінаннем Ф.І. Шмакава.<br>Выразкі з газет | 1950 | 2 | 2 | |
| 49 | Рэцэнзіі В. Карамышава, Г.Д. Коласа, Л. Пчолкіна на спектакль "Алазанская даліна", пастаўлены ў тэатры імя Я. Коласа, з упамінаннем Ф.І. Шмакава.<br>Выразкі з газет | 1953 - 1960 | 3 | 3 | |
| 50 | Рэцэнзія і водгук А. Ларчанкава на спектакль "Несцерка", пастаўлены ў тэатры імя Я. Коласа, з упамінаннем Ф.І. Шмакава.<br>Выразкі з газет | [1963] - 1972 | 2 | 2 | |
| 51 | Водгукі А.П. Бялевіча, А. Бурдзель і гледачоў на спектакль "Цэнтральны ход", пастаўлены ў тэатры імя Я. Коласа, з упамінаннем Ф.І. Шмакава.<br>Выразкі з газет | 1948 | 2 | 2 | |
| | **4. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 52 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава, індывідуальныя.<br>Арыгіналы і копія | [1930-я - пач. 1970-х гг.] | 5 | 5 | |
| 53 | Фатаграфія Ф.І. Шмакава з З.І. Канапелькай | [пач. 1950-х гг.] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 54 | Фатаграфія Ф.І. Шмакава ў группе са студэнтамі Ленінградскага тэатральнага інстытута ў час выканання акрабатычнага эцюда | [1935 - 1939] | 1 | 1 | |
| 55 | Фатаграфія Ф.І. Шмакава (у грыме Леніна) з удзельнікамі спекталя тэатра імя Я. Коласа "Вечная крыніца" | 1957 | 1 | 1 | |
| 56 | Фатаграфія Ф.І. Шмакава ў группе з А.К. Ільінскім, Л.Р. Лагун, Б.М. Левіным, Ю.Б. Шчарбаковым, А.Р. Шэлегам у двары Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР у час гастроляў у Мінску | [1959 - 1962] | 1 | 1 | |
| 57 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава з М.М. Яроменкам у час адпачынку | [1950-я гг.] | 3 | 3 | |
| 58 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава з рэкардсменкай свету па парашутнаму спорту В. Дзярабінай і інш. на аэрадроме ДТСААФ (ДОСААФ) БССР.<br>Арыгінал, выразка з газеты | 1961 | 2 | 2 | |
| 59 | Фатаграфія Ф.І. Шмакава і Я.С. Мацвеева ў | [1961] | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | касцюмах сваіх герояў з гледачамі пасля прагляду мастацкага фільма А. Іванова "Поднятая целина" у час Кінафестывалю ў г.Краснадары | | | | |
| 60 | Фатаграфіі Ф.І. Шмакава, індывідуальныя і ў групе ў час сустрэчы з супрацоўнікамі калектыва Верхнядзвінскага аддзела міліцыі | 1968 | 2 | 2 | |
| 61 | Фатаграфія Ф.І. Шмакава з Я.П. Шыпілам на сходзе ў вайсковай часці | [1970-я гг.] | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 61 (шэсцьдзесят адзін)

спраў з № 1 па № 61 , 126 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.